■ Сезонны клопат

КВІТНЕЙ, СТАЛІЦА!

«Хакеісты», дрэвы ў кадках і бэзавыя алеі — такім будзе зялёны ўбор Мінска

Сёлета ў Мінску з'явяцца новыя кветкавыя кампазіцыі, некаторыя з іх распрацаваны спецыяльна да чэмпіянату свету па хакеі, паведаміла падчас прэс-канферэнцыі кіраўніца службы па добраўпарадкаванні і ўтрыманні аб'ектаў зялёнай гаспадаркі «Мінскзелянбуда» Анжаліка ПУЗАНКОВА.

«Паколькі мы прымаем чэмпіянат, падрыхтоўку да веснавога ўпрыгожвання горада кветкамі мы пачалі яшчэ ўвосень, — распавяла Анжаліка Пузанкова. — На прадпрыемствах зялёнага будаўніцтва было высаджана 350 тысяч цыбулін раслін. Гэта больш, чым у мінулых гадах, бо мы хацелі надаць аб'ектам максімальны дэкаратыўны эфект, выкарыстаўшы прыгажосць вясновай квецені».

Аснову асартыменту раслін складаюць цюльпаны, нарцысы і гіяцынты. Мяркуецца, што першыя кветкі на клумбах з'явяцца ў 20-х чыслах красавіка.

Спецыялісты прадпрыемства распрацавалі новыя кветкавыя канструкцыі, у тым ліку эмблему хакейнага чэмпіянату. Пано, на якім яна будзе высаджана расадай, усталююць у зоне гасціннасці каля Палаца спорту. Апроч таго, ва ўсіх зонах гасціннасці з'явяцца дадатковыя канструкцыі з раслінамі, а сачыць за чысцінёй на аб'ектах чэмпіянату будуць мабільныя брыгады, работа якіх арганізавана ў трохзменным рэжыме.

Як адзначыла спецыяліст, пасля чэмпіянату па хакеі добраўпарадкаванне працягнецца. Сёлета беларусаў чакае шырокае святкаванне 70-годдзя вызвалення краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і шэраг іншых мерапрыемстваў, да якіх «Мінскзелянбуд» таксама рыхтуецца. Так, праспект Незалежнасці ад Кастрычніцкай плошчы да плошчы Перамогі таксама ўпрыгожаць новыя вертыкальныя кветкавыя канструкцыі — гэты ўчастак вызначаны маршрутам шэсця ветэранаў падчас парада. Сама Кастрычніцкая плошча таксама пераўтворыцца.

«Паколькі ў нас вельмі шмат брукаваных участкаў (тая ж Кастрычніцкая плошча — па сутнасці вялікае шэрае поле), сёлета мы паставім там кантэйнеры з дрэвамі і канструкцыі з павойнымі раслінамі», — паведаміла Анжаліка Пузанкова.

Але гэта яшчэ не ўсе «зялёныя» цікавінкі, якія парадуюць жыхароў і гасцей сталіцы.

«Да даты вызвалення запланавана закладка алей з бэзу, сарты якога маюць назвы, звязаныя з Вялікай Айчыннай вайной: «Зоя Касмадзям'янская», «Маршал Жукаў» і іншыя, — праананасавала спецыяліст «Мінскзелянбуда». — Іх вывеў батанічны сад Валгаграда і перадаў нам, каб 3 ліпеня мы сумесна з ветэранамі высадзілі іх у парках Чалюскінцаў, Перамогі і Лошыцкім».

Дарэчы, у справе азеляненння горада бяруць удзел не толькі работнікі «Мінскзелянбуда», але і грамадзяне. Бо, як адзначыла кіраўніца службы прадпрыемства, калі чалавек сам садзіць дрэва, ён пачынае па-іншаму да яго ставіцца. Па словах Анжалікі Пузанковай, з жаданнем паўдзельнічаць у пасадках штогод звяртаецца шэраг арганізацый. Для іх спецыялісты арганізуюць пляцоўкі — хаця б па адной у кожным раёне сталіцы.

Аднак дрэвы ў Мінску не толькі садзяць, але і высякаюць, напрыклад, для разгортвання будаўнічых пляцовак.

«Я б не сказала, што высяканне ў зоне будаўніцтва актыўнае, — заўважыла Анжаліка Пузанкова. — Калі без яго нельга абысціся (а такія пытанні вырашаюцца пры дапамозе экспертызы), ставіцца задача максімальнага захавання кожнага дрэва».

Пры гэтым да моманту высечкі насаджэнняў на будучых будпляцоўках заключаецца дагавор на выкананне кампенсацыйных пасадак (ад двух да дзесяці дрэў за кожнае ссечанае), месцы для якіх вызначаюцца на тэрыторыі горада адпаведнымі камісіямі.

Дзіяна СЕРАДЗЮК

КРУЦІ, НЕ КРУЦІ, А ШТО ПАВІНЕН — ЗАПЛАЦІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Між іншым, спосабы гэтыя для кожнай «групы» даўжнікоў розныя. Напрыклад, спецыялісты цэнтра не абышлі ўвагай аматараў таннага алкаголю, якія ўваходзяць у «групу рызыкі» па няплаце ЖКП. Спецыяльна для такіх грамадзян на бутэлькі з іх улюбёным пладова-ягадным напоем клеілі налепкі пра неабходнасць аплачваць камунальныя паслугі. Адметна, што тэкст на іх быў значна больш міралюбівы, чым тыя ж папярэджванні Міністэрства аховы здароўя, на якія ўжо мала хто звяртае ўвагу. Цалкам верагодна, што змест налепак прымусіў кагосьці прызадумацца. Бо, па-першае, такі ход быў нечаканым, а па-другое, усяляў у спажыўцоў віна спадзяванне, што выйсце ёсць заўсёды, і заплаціць за паслугі ніколі не позна.

А яшчэ даўжнікам неяк дасылалі паштоўкі, дзе віншавалі з... днём народзінаў цэнтра. І ў іх пазначалі агульны памер запазычанасці і што можна было б зрабіць за гэтыя грошы, калі б яны паступілі ў бюджэт.



Павел Жуйкоў: «За суму доўгу можна было ўсталяваць ліфты, адрамантаваць дахі і пад'езды...»

Дапамогу дадуць. Крэдыт — не

У «групу рызыкі» з неаплачанымі жыроўкамі нярэдка трапляюць шматдзетныя маці, якія засталіся адны, і адзіная крыніца іх даходу — дапамога па доглядзе дзіцяці. Яны і рады аплаціць паслугі, ды грошай не хапае. Але не ўсе ведаюць, што такія сем'і маюць права на адрасную сацыяльную дапамогу. Большасць дакументаў для гэтага фарміруецца ў разлікова-касавым цэнтры літаральна за 10 хвілін. Заяўніку неабходна мець толькі даведку пра даходы з фонду сацабароны.

— У нас было каля 300 такіх сем'яў, кожную з іх мы пракансультавалі, і 50 сем'яў летась атрымалі дапамогу ў 50 мільёнаў рублёў — прыкладна па мільёну кожная, — паведаміў Павел Жуйкоў.

Калі працягваць гаворку пра грошы, то нават з эканамічнага пункту гледжання ЖКП лепей аплачваць своечасова. Пеня за няплату складае 0,3% на дзень. За год гэта амаль 110%. Крэдыты ў банках абыходзяцца танней, чым пратэрміноўка аплаты, але і іх магілёўскія неплацельшчыкі ў выпадку патрэбы рызыкуюць не атрымаць. Справа ў тым, што цэнтр гарадскіх інфармацыйных сістэм супрацоўнічае з большасцю банкаў, якія дзейнічаюць у нашай краіне. Цяпер пры выдачы крэдытаў службы бяспекі банкаў могуць праверыць не толькі крэдытную гісторыю кожнага магіляўчаніна, але і яго здольнасць аплачваць ЖКП. І недысцыплінаванасць па аплаце за кватэру можа стаць нагодай для адмовы ў атрыманні крэдыту.

Сапраўды, перад пагрозай страціць сваё жыллё неплацельшчыкі здольныя знайсці грошы на аплату паслуг у апошні момант перад высяленнем.

Цяпер, нават знаходзячыся за мяжой, пры дапамозе адзінай разліковай інфармацыйнай прасторы жыллёва-камунальныя паслугі можна аплачваць дыстанцыйна.

Бізуном і пернікам

Па словах Паўла Жуйкова, новых ідэй па барацьбе з неплацельшчыкамі ў супрацоўнікаў цэнтра шмат, але пакуль што іх трымаюць у сакрэце. Бо камунальнікі любяць «радаваць» даўжнікоў сюрпрызамі.

— Напярэдадні Новага года, 30—31 снежня нашы спецыялісты сумесна са слесарамі-сантэхнікамі хадзілі і адключалі паслугі. Неверагодна, але сродкі на аплату адразу знаходзіліся, бо каму хочацца застацца ў Новы год без гарачай вады? Такі спосаб аказаўся дзейсным і дзякуючы таму, што многіх складана бывае заспець дома, а ў свята амаль усе былі.

Аднак у горадзе на Дняпры не толькі змагаюцца з даўжнікамі, але і заахвочваюць добрасумленных плацельшчыкаў. Вялікую папулярнасць у абласным цэнтры набыла ўнікальная штогадовая гульня «Самы дысцыплінаваны плацельшчык ЖКП», якая праводзіцца ўжо цягам дзевяці гадоў. Летась гульня сабрала дзевяць тысяч удзельнікаў — гэта прыкладна 7,5% асабовых рахункаў.

— Кожны раз мы вызначаем новыя крытэрыі ўдзельнікаў гульні. Сёлета было тры намінацыі. Першая — тыя, хто аплачваў паслугі загадзя — да 15 чысла. Другая намінацыя — людзі, што плацілі з авансам. І трэцяя — гараджане, у якіх плату, паводле іх заявы, утрымлівалі з заробку.

Падчас розыгрышу ў канферэнц-залу цэнтра запрашаюць удзельнікаў, гледачоў, СМІ, спонсараў і шляхам латарэі выцягваюць купоны з адрасамі пераможцаў. Сёлета выйгрыш атрымалі 160 рахункаў, на кожны з іх было залічана па 100 тысяч рублёў.

— У межах гульні мы штогод заахвочваем якога-небудзь чалавека ці сям'ю, дорым ім падарункі ад спонсараў. Узнагароджвалі і самага старога добрасумленнага плацельшчыка, і самага маладога... А сёлета падарунак атрымала шматдзетная сям'я, дзе маці пяцярых дзяцей за пяць гадоў ні разу не дапусціла запазычанасці.

А яшчэ цэнтр заключае дагаворы з арганізацыямі, што аказваюць паслугі ці прадаюць тавары. Напрыклад, у адной з магілёўскіх крам добрасумленны плацельшчык можа набыць у беспрацэнтную расстрэрміноўку на тры месяцы бытавую тэхніку айчыннай вытворчасці. Прычым частка сумы за тавар уносіцца адразу, а астатняя частка выстаўляецца асобным радком у жыроўцы.

Што чакае злосных неплацельшчыкаў?

Вось такі творчы падыход да такой, здавалася б, будзённай працы. Але, як заўважыў Павел Жуйкоў, пералічаныя вышэй метады ўздзейнічаюць на людзей, здольных ісці на супрацоўніцтва з камунальнікамі. Але ёсць і такія, хто не звяртае ўвагі ні на якія іх захады. У такіх выпадках, калі даўжнік мае крыніцу даходу, яго частку ўтрымліваюць на аплату паслуг. А калі даходаў у чалавека няма, адчужаюць жылое памяшканне. Але гэта не з'яўляецца мэтай працы, падкрэсліў намеснік дырэктара. За 2013 год было пададзена 62 заявы на адчужэнне, з іх выселілі толькі дзве сям'і. Спецыялісты цэнтра лічаць гэта поспехам.

А такія заклікі можна было бачыць на бутэльках з танным алкаголем.

Права на адрасную сацыяльную дапамогу маюць шматдзетныя маці, якія засталіся адны, і адзіная крыніца іх даходу — дапамога па доглядзе дзяцей.

Сапраўды, перад пагрозай страціць сваё жыллё (а з прыняццем новага Жыллёвага кодэкса гэта стала магчыма не толькі з дзяржаўным, але і з прыватным жылым фондам) неплацельшчыкі здольныя знайсці грошы на аплату паслуг у апошні момант перад высяленнем.

Увогуле, паводле слоў Паўла Жуйкова, заканадаўца даў неплацельшчыкам вялікі шанц захаваць сваю ўласнасць. Бо адлік перыяду неплацяжоў пачаўся з моманту ўступлення кодэкса ў дзеянне, значыць, толькі з мінулай восені можна было пачынаць з імі барацьбу. Пасля паўгадовай запазычанасці мясцовыя органы ўлады папярэджваюць чалавека пра неабходнасць аплаты. Калі цягам месяца запазычанасць не пагашаецца, мясцовы выканкам можа звярнуцца ў суд. І тады неплацельшчыку даецца яшчэ год для выпраўлення сітуацыі. Толькі пасля гэтага суд можа прыняць рашэнне аб продажы кватэры неплацельшчыка і набыцці для яго іншага жылля (з меншай плошчай, горшымі ўмовамі і нават у іншым населеным пункце). Грашовая розніца пойдзе на пагашэнне запазычанасці, і калі яшчэ застанецца нейкая сума, яе вернуць «перасяленцу».

Частку людзей такія меры сапраўды матывуюць: колькасць уласнікаў сярод злосных неплацельшчыкаў у Магілёве на 1 студзеня 2013 года складала 45%, а на 1 студзеня 2014 года — ужо 40%.

А калі і перасяленне не ўздзейнічае, і чалавек усё адно не плаціць, кола санкцый пачынае свой ход ад самага пачатку — ад званкоў, пісьмовых просьбаў і апавяшчэнняў да адключэння паслуг, судовых іскаў... І ўрэшце калі-небудзь неплацельшчык акажацца ў такіх умовах, за якія і плаціць асабліва не давядзецца...

***

Паводле звестак Мінжылкамгаса, на 1 студзеня 2014 года агульная сума пратэрмінаванай запазычанасці па аплаце ЖКП склала 33,7 млрд рублёў, гэта на 10,2 % больш, чым летась. Самыя вялікія сумы ўтварыліся ў Магілёўскай (7,8 млрд рублёў) і Мінскай (7,5 млрд рублёў) абласцях. Адметна, што колькасць рахункаў, па якіх утварылася запазычанасць, у параўнанні з мінулым годам скарацілася са 162,7 тысячы да 148,8 тысячы.

Таксама цягам 2013 года ў краіне ў выніку працяглай няплаты за ЖКП у памяшканні з меншай плошчай былі пераселены 93 сям'і: 20 сем'яў у Брэсцкай вобласці, 10 — у Віцебскай, 14 — у Гомельскай, 12 — у Гродзенскай, 18 — у Магілёўскай, 7 — у Мінскай. У сталіцы перасяленне спасцігла 12 сем'яў.

Дзіяна СЕРАДЗЮК.
Фота аўтара.
Мінск — Магілёў — Мінск.